ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

№ 3 (885) | Аўторак, 21 лютага 1995г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## З ГАНАРОВЫМ ЗВАННЕМ!

**За значны ўклад у развіццё беларускай навукі Указам Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ад 13 лютага 1995 г. прысвоена званне "Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь" рэктару нашага універсітэта Леаніду Аляксандравічу Шамяткову. З гэтай нагоды яго горача віншуе ўвесь калектыў ГДУ і жадае новых поспехаў у развіцці навукі і падрыхтоўцы маладых спецыялістаў.**

## АБМЕРКАВАЛІ НАРОДНЫЯ ДЭПУТАТЫ

9-га лютага адбылася чарговая сесія Гомельскага абласнога Савета народных дэпутатаў 21-га склікання. Савет разгледзеў пытанні аб ходзе рэалізацыі антыкрызіснай праграмы і перспектыве эканамічнага і сацыяльнага развіцця вобласці на 1995 год; аб бюджэце вобласці на 1995 год і аб выкананні бюджэту за 1993 год.

Пры абмеркаванні заслуханых пытанняў выступіў прарэктар нашага універсітэта па вучэбнай рабоце дэпутат М.М.Воінаў. Ён гаварыў аб неабходнасці распрацоўкі адзінай кадравай маладзёжнай палітыкі. У вобласці 6 вышэйшых навучальных устаноў. Ва ўмовах крызісу, няспыннага росту цэн мэтазгодна скаапераравацца і стварыць адзіную міжвузаўскую бібліятэку, адзіны міжвузаўскі творчы цэнтр, стадыён, падзяліцца месцамі ў студэнцкіх інтэрнатах.

Па абмеркаваных на сесіі пытаннях прыняты адпаведныя рашэнні.

## ДАПАМОГА АД НЯМЕЦКІХ СЯБРОЎ

У майскім нумары нашай газеты за мінулы год паведамлялася, што паміж выкладчыкамі кафедры нямецкай і французскай моў ГДУ і пастарам Мюллерам і пані Вештэдт з г.Альтэнмедзінгена Германії завязаліся сяброўскія адносіны. Вынікам гэтага стала гуманітарная дапамога -- пішучыя машынкі, папера для друкавання, касеты з запісамі тэкстаў для пераказу, якая паступіла у наш універсітэт мінулай вясной у дапамогу выкладчыкам і студэнтам.

Нядаўна нямецкія сябры даставілі новы дар. На гэты раз -- кніжныя шафы, крэслы, капіравальную машыну і паперу для яе.



Фота У.Чысціка.

Гэты здымак быў зроблены на пасяджэнні Савета універсітэта 2-га лютага. Рэктар член-карэспандэнт АН Беларусі Л.А.Шамяткоў уручыў дыпломы прафесара і акадэміка Міжнароднай Акадэміі акмеалагічных навук доктару педагагічных навук з кафедры педагогікі Герою Сацыялістычнай Працы Міхаілу Афанасьевічу ДЗМІТРЫЕВУ.

## ГОМЕЛЬШЧЫНА: СТАРОНКІ МІНУЛАГА

На такой тэме 15-16 лютага г.г. правялі навуковую канферэнцыю Гомельскі дзяржуніверсітэт імя Ф.Скарыны, Гомельская філія Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына", Гомельская абласная філія рэспубліканскага Фонду падтрымкі дэмакратычных рэформ імя Льва Сапегі.

На пачатку канферэнцыя праходзіла ў Гомельскім культурна-палітычным цэнтры. Уступнымі словамі яе пленарнае пасяджэнне адкрылі старшыня аргкамітэта канферэнцыі прарэктар нашага універсітэта па вучэбнай рабоце дацэнт М.М.Воінаў і старшыня рады Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына" Г.І.Сурмач. Было заслухана 2 даклады. Сааўтарам аднаго з іх -- "Краязнаўства Гомельшчыны і актуальныя праблемы збярэжання гісторыка-культурнай спадчыны" -- стаў намеснік дэкана гісторыка-юрыдычнага факультэта дацэнт Г.А.Аляксейчанка.

Затым канферэнцыя працягвала сваю работу ў вучэбным корпусе №1 нашага універсітэта па секцыях: "Гісторыка-культурная спадчына Гомельшчыны", "Гомельшчына ў кантэксце беларускага нацыянальнага адраджэння", "Фашысцкая акупацыя і антыфашысцкае супраціўленне на Гомельшчыне".

На секцыйных пасяджэннях выкладчыкамі нашага універсітэта было зроблена звыш 15 навуковых паведамленняў.

Узровень канферэнцыі быў дастаткова высокі. У ёй прынялі ўдзел доктар філасофскіх навук У.М.Конан з Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Ф.Скарыны, навукоўцы з Інстытута гісторыі АНБ, БДУ, іншых вышэйшых навучальных устаноў, Нацыянальнага архіва Беларусі, выкладчыкі-гісторыкі і іншыя работнікі, якія маюць дачыненне да мінулага нашай Бацькаўшчыны і яе адраджэння.

## НОВАЕ НАВУКОВАЕ ТАВАРЫСТВА

У Беларускай політэхнічнай акадэміі прайшоў 1-ы Беларускі ўстаноўчы кангрэс па тэарэтычнай і прыкладной механіцы -- "Механіка-95", арганізаваны Міністэрствам адукацыі і навукі АН Рэспублікі Беларусь. На гэтым форуме разгледжаны даклады вядучых вучоных аб сучасных праблемах механікі, вызначаны шляхі яе далейшага развіцця ў Беларусі. Кангрэс з'явіўся значным крокам у мэтах інтэграцыі навуковых школ і выхаду на міжнародны ўзровень. У яго рабоце ўдзельнічала каля 280 вучоных, з іх 5 акадэмікаў, 3 члены-карэспандэнты АН Беларусі, 80 дактароў навук, у тым ліку вучоныя з Расіі, Украіны, Польшчы, Германіі.

Ад Гомельскага дзяржуніверсітэта былі прадстаўлены пленарны даклад аўтара гэтых радкоў "Метады рашэння кантактных задач для цел з кампазітаў", а таксама паведамленні Г.М.Дзёмава, Г.В.Фаміной, А.В.Лубачкіна, Е.А.Ружыцкай. Г.А.Карасёвай, Ю.А.Кашына.

Кангрэс выбраў пастаяннадзеючы аргкамітэт, у які ўвайшлі вядомыя вучоныя -- акадэмікі М.С.Высоцкі, Б.А.Калавандзін, член-карэспандэнт АН Беларусі Ю.М.Плескачэўскі, д.ф.-м.н. Ф.М.Кірылава і іншыя, арганізаваў Беларускае таварыства інжынераў-механікаў з прэзідэнтам акадэмікам М.С.Высоцкім.

Жадаючыя могуць стаць членамі гэтага таварыства. Наступны кангрэс будзе праводзіцца праз тры гады.

**В.МАЖАРОЎСКІ,**
**доктар тэхнічных навук, прафесар кафедры ВМ і праграміравання, член аргкамітэта кангрэса.**

З Савета універсітэта

# ПРЫ ЖОРСТКІМ ФІНАНСАВЫМ РЭЖЫМЕ

## (Са справаздачы галоўнага бухгалтара І.А.Куравай)

Па стану на 1-га студзеня 1995 г. баланс ГДУ ў актыве і пасіве склаў 3 мільярды 511 мільёнаў рублёў.

Набыта асноўных сродкаў і атрымана бясплатна на агульную суму 3 мільярды 197 мільёнаў рублёў.

Фінансаванне расходаў універсітэта па падрыхтоўцы спецыялістаў ажыццяўлялася летась за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Каштарыс расходаў па бюджэту выкананы ў поўнай суме фінансавання з перарасходам па артыкулу 18 "Іншыя расходы" на суму 90 млн.руб. Прычына гэтага -- у росце цэн і тарыфаў на камунальныя паслугі /ацяпленне, гарачае водазабеспячэнне, водазабеспячэнне і каналізацыя/.

Рост цэн на камунальныя паслугі пастаянна апярэджваў паступленне на наш разліковы рахунак фінансавання. Плата ж за гэтыя паслугі спісвалася з рухунка ГДУ плацёжнымі патрабаваннямі на інкасо. Таму стрымлівалася асваенне астатніх артыкулаў каштарыса.

За 1994 год чакаўся перарасход сродкаў па іншых артыкулах на 450 млн.руб. Толькі дадатковае фінансаванне , якое паступіла 30 снежня ў суме 362 млн.руб. на камунальныя паслугі, дазволіла разлічыцца за работы, праведзеныя па капітальнаму рамонту будынкаў і збудаванняў, аказаць матэрыяльную дапамогу па 80 тыс. руб. кожнаму працуючаму, выплаціць датэрмінова заработную плату за другую палову снежня.

Адначасова было неасваенне сродкаў па артыкулу "зарплата" з-за наяўнасці вакансій прафесарска-выкладчыцкага саставу /сярэднегадавая колькасць -- 36 ставак/. На 1 студзеня 1995 г. заставалася 15 вакансій. Не асвоены і артыкул 14 "Набыццё мяккага інвентару". Часткова не асвоены арт.9 "Харчаванне дзяцей-сірот".

Цяжкасці ў фінансаванні, пастаяннае спісанне з нашага рахунку сродкаў за камунальныя паслугі і стрымліванне іх для своечасовай выплаты зарплаты выкладчыкам і супрацоўнікам, а таксама стыпендый студэнтам /за ўвесь 1994 год не было ніводнага іх зрыву /, змяненне шэсць разоў выкладчыкам і чатыры разы супрацоўнікам пасадавых акладаў у сувязі з ростам мінімальнай заработнай платы і стаўкі I разраду, моцна адбіліся на рабоце ўсіх падраздзяленняў. Але асноўная нагрузка легла на работнікаў уліку, планавага аддзела і аддзела кадраў.

Колькасць студэнтаў стацыянара на 1 студзеня 1995 г. перавысіла планавыя паказчыкі на 36 чалавек, а сярэднегадавы -- на 33. Гэта прывяло да перавышэння сум выплачаных стыпендый за кошт сродкаў бюджэту. Павялічыўся адток студэнтаў стацыянара на завочны факультэт, але, адначасова, вырасла колькасць студэнтаў, адноўленых на вучобу і пераведзеных з іншых ВНУ на стацыянар. Склалася сітуацыя, калі асобныя студэнты не будуць забяспечаны фінансаваннем, у тым ліку стыпендыяй. Далейшыя пераводы, аднаўленне студэнтаў на стацыянар за кошт сродкаў бюджэту магчымы толькі ў выключных выпадках.

Акрамя бюджэтных асігнаванняў для пакрыцця расходаў універсітэта на навучанне і падрыхтоўку спецыялістаў выкарыстоўваліся пазабюджэтныя сродкі. Асноўныя віды гэтых даходаў: навучанне беларускіх студэнтаў, слухачоў падрыхтоўчага аддзялення, аспірантаў, саіскальнікаў -- 63 млн.руб. Ад факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў паступіла 36 млн.руб., за навучанне замежных студэнтаў і аспірантаў, магістраў, вучобу слухачоў падрыхтоўчага аддзялення мы атрымалі 97 млн.руб. Спонсарскія сродкі, ахвяраванні фізічных і юрыдычных асоб, сродкі на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы склалі ў агульнай суме 181 млн.руб. З іх 49 млн.руб. патрачана на набыццё абсталявання, 3 млн.руб. -- на капітальны рамонт, 13 млн.руб. на іншыя расходы. 72 млн.руб. пералічаны ў дзяржаўны бюджэт ў якасці падаткаў на дабавачны кошт.

З 1-га студзеня ў Рэспубліцы Беларусь пры Мінфіне створана казначэйства, якое забяспечвае кантроль за размеркаваннем сродкаў па ВНУ ў адпаведнасці з каштары[illegible]сам расходаў. Так, за першы месяц бяг[illegible]чага года наш універсітэт прафінансаваны ў суме 960,9 млн.руб. Для таго, каб забяспечыць выплату заработнай платы 2-га лютага, не прадставілася магчымым правесці абавязковыя плацяжы па падаходнаму падатку ў суме 32 млн.руб. і адлічыць 115 млн.руб. у фонд сацыяльнай абароны насельніцтва, што прывядзе да штрафных санкцый.

У сувязі з павелічэннем аб'ёму фінансавага дакументазвароту, з-за ўвядзення паартыкульнага фінансавання банкі не паспяваюць своечасова апрацоўваць дакументы. У выніку фінансаванне прыходзіць са значным спазненнем, што можа прывесці ў далейшым да несвоечасовай выплаты зарплат і стыпендый, расходаў на камандзіроўкі, павышэнне кваліфікацыі і г.д. Таму нам трэба працаваць у самым строгім рэжыме эканоміі, з улікам выдзяляемых сродкаў.



# МУЖЧЫНЫ -- ДА ПЛІТЫ !

У дзень свята 8 Сакавіка ўсім жанчынам асабліва прыемная ўвага да іх. Ужо раніцай гэтага вясенняга дня яны чуюць словы віншаванняў, шмат заслужаных кампліментаў і чакаюць вызвалення ад традыцыйных хатніх клопатаў. Іх у гэтае свята бярэ на сябе мужчынская палова.

Конкурс "Сладкоежка", які праводзіўся ў праграме ММФ "Арт-сесія-94" ў лістападзе мінулага года, яскрава прадэманстраваў высокія кулінарныя якасці мужчын. Нездарма ж лепшымі майстрамі гэтай справы ва ўсім свеце заўсёды лічыліся менавіта яны.

Культурны цэнтр універсітэта запрашае ўсіх выкладчыкаў і супрацоўнікаў ГДУ на святочны вечар, прысвечаны жаночаму святу 8 Сакавіка і аб"яўляе конкурс сярод мужчын прафесарска-выкладчыцкага саставу, а таксама супрацоўнікаў і аспірантаў на лепшае прыгатаванне страў да святочнага стала. Увасабляючы рэцэпты сваіх фірменных страў -- гарачых і халодных, салатаў, дамашніх вінаў і лікёраў, кандыдарскай выпечкі, вы тым самым прыемна здзівіце жанчын і членаў журы, якія па вартасці ацэняць ваша майстэрства, фантазію і каханне да лепшай паловы чалавецтва -- жанчын. Усіх удзельнікаў гэтага незвычайнага конкурсу чакаюць каштоўныя прызы, а самага непераўзыдзенага -- Гран-пры.

Святочны вечар акрамя конкурсу ўключае і забаўляльную праграму, дзе вы зможаце павіншаваць жанчын усяго універсітэта, сваіх каханых і дарагіх жонак і маці, калег па працы. Выкарыстаўшы свабодны мікрафон і музычныя інструменты, вы зможаце паспяваць, пачытаць вершы, своеасабліва і цікава павіншаваць усіх са святам і, зразумела, запрасіць на танец.

Такім чынам, мы запрашаем усіх выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта **7-га сакавіка ў 17.00** ў фае актавай залы вучэбнага корпуса № 1.

Паважаныя мужчыны! Вашы заяўкі на ўдзел у конкурсе святочных страў мы чакаем **да 2-га сакавіка** па адрасу: вучэбны корпус № 1, ауд. 1-8 і 1-7а. Тэлефоны для даведак: 57-33-30 і 57-11-17.

**КУЛЬТУРНЫ ЦЭНТР ГДУ. АРГКАМІТЭТ.**



СЕМІНАР НА БІЯФАКУ

# ПА ПРАБЛЕМАХ ЭКАЛОГІІ

На біялагічным факультэце нашага універсітэта праведзены семінар на тэму: "Экалогія: рэгіянальныя праблемы і экалагічная адукацыя". На яго былі запрошаны кіраўнікі ВНУ і НДІ г.Гомеля, абласнога камітэта па экалогіі, аддзелаў і ўпраўленняў па экалогіі абласнога і раённых выканкомаў, прадстаўнікі абласнога ўпраўлення і раённых аддзелаў адукацыі, загадчыкі кафедр экалогіі, выкладчыкі і студэнты біялагічнага, эканамічнага факультэтаў, фізічнай культуры, вучні школы-ліцэя N56.

З уступным словам на семінары выступіў рэктар універсітэта член-карэспандэнт АНБ, прафесар Л.А.Шамяткоў.

Затым дэкан біялагічнага факультэта дацэнт С.Ф.Алешка спыніўся на сучасных аспектах развіцця біялагічнага факультэта і праблемах падрыхтоўкі спецыялістаў -біёлагаў і эколагаў для патрэб Гомельскага рэгіёна. Аб экалагічных даследаваннях і экалагічнай адукацыі гаварыў у сваім выступленні намеснік дэкана біяфака па навуцы, д.б.н., праф. В.В.Валетаў. Старшыня абласнога камітэта па экалогіі М.А.Мачуленка расказаў аб [illegible]лагічнай сітуацыі і ахове прыроды ў Гомельскай вобласці. Намеснік дырэктара па навуцы Інстытута лесу АНБ д.с.-г.н., праф. У.Ф.Багінскі прысвяціў сваё паведамленне экалогіі лясных сатаварыстваў у сувязі з радыяцыйным забруджаннем.

Пры абмеркаванні заслуханых паведамленняў выступілі: намеснік дырэктара на НДР БелНДІ сельскагаспадарчай радыялогіі В.С.Аверын, выканаўчы дырэктар Гомельскага аддзялення Фонда Сораса Ю.І.Варонежцаў, дырэктар абласной праектна-пошуковай станцыі хімізацыі сельскай гаспадаркі В.К.Хоміч, намеснік пракурора Гомельскай прыродаахоўнай пракуратуры В.І.Бурлакоў, намеснік начальніка упраўлення аблвыканкома па радыяцыйнай абароне, бяспецы насельніцтва і экалогіі М.І.Ермакоў, галоўны ўрач Гомельскага абласнога цэнтра эпідэміялогіі і гігіены В.І.Ключановіч і выкладчыкі біялагічнага факультэта.

Праведзены семінар засведчыў, што нам яшчэ трэба шмат папрацаваць, каб палепшыць экалагічную сітуацыю на тэрыторыі, пацярпеўшай ад катастрофы на ЧАЭС, пашырыць падрыхтоўку спецыялістаў-эколагаў.

# ФІЗКУЛЬТУРА СУПРАЦЬ РАДЫЯЦЫІ

У наш час, на жаль, адсутнічаюць рэкамендацыі па выкарыстанню сродкаў фізічнай культуры і спорту ў экалагічна забруджаных рэгіёнах рэспублікі. Важна падкрэсліць, што каштоўнасць пастаяннага выкарыстання фізічных практыкаванняў якраз і складаецца з таго, што разам з развіццём рухальных якасцей і навыкаў павышаецца неспецыфічная ўстойлівасць арганізма, у тым [illegible] і да ўздзеяння радыяцыі.

[illegible] якасці пацвярджэння сказанаму, прывяду некаторыя факты. У 1960 годзе ў доследах на жывёлінах высветлілася, што сістэматычныя фізічныя нагрузкі павышалі ўстойлівасць нават да пранікаючай радыяцыі.

Пасля рэнтгенаўскага абпраменьвання ў вялікай дозе /350 рэнтген/ у трэніраваных жывёлін аказалася амаль у два разы менш пашкоджаных клетак у кішэчніку, чым у нетрэніраваных. На думку даследчыкаў, у першых больш інтэнсіўна працякаюць аднаўленчыя працэсы, што прыводзіць да памяншэння шкоднага эфекту ў радыяцыі.

У доследах на жывёлінах /пацуках/ стварылі розныя рухальныя рэжымы, а затым абпраменьваннем праверылі на выжыванне. Першая група жывёлін -- кантрольная, знаходзілася ў звычайных умовах утрымання; другая -- "фізкультурнікі", атрымлівала ўмераную плавальную трэніроўку; трэцяя -- "спартсмены", трэніраваліся на калягранічных нагрузках. Аб устойлівасці да радыеактыўнага абпраменьвання меркавалі па ліку загінуўшых ад яго ў кожнай групе. Найбольш устойлівымі аказаліся "фізкультурнікі", на другім месцы -- "спартсмены" і найменш устойлівымі -- прадстаўнікі першай групы...

Падагульняючы гэтыя факты, можна зрабіць наступны вывад: фізічныя практыкаванні павышаюць устойлівасць да радыяцыі.

Даследаванні, праведзеныя на нашай кафедры, паказалі, што нават 24-дзённае знаходжанне школьнікаў Гомельскай вобласці на базе адпачынку "Залатыя пяскі" дазволіла павысіць узровень здароўя. Асаблівую эфектыўнасць аказваюць эмацыянальныя рухальныя гульні і эстафеты з бегам і скачкамі, якія праводзяцца тры разы ў тыдзень пры штодзённай ранішняй гігіенічнай гімнастыцы.

Даводзіцца шкадаваць, што аздараўленчая роля фізкультуры ў забруджаных раёнах вельмі недастаткова ўлічваецца адміністрацыйнымі органамі ўсіх узроўняў.

У рэкамендацыях, распрацаваных выкладчыкамі нашай кафедры, прапануюцца для тэрыторый з забруджаннем ад 1 да 5 кюры ўсе віды спорту пры абавязковай умове -- сістэматычным іх выкананні.

У зоне ад 5 да 15 кюры можна займацца ўсімі даступнымі відамі спорту ў закрытых памяшканнях, але іх трэба сумяшчаць з прагулкамі на паветры, пажадана каля вадаёмаў.

І, нарэшце, у зонах з забруджаннем вышэй 15 кюры займацца фізічнымі практыкаваннямі пажадана раніцай на свежым паветры або пасля дажджоў. Не трэба забываць, што вечарамі ў гэтых раёнах шмат радыяцыйнага пылу. Больш таго, заняткі павінны праходзіць пад кіраўніцтвам спецыяліста і, калі з'яўляецца стомленасць, нагрузка зніжаецца або наогул спыняецца.

Не трэба ігнараваць такой важнай гігіенічнай працэдурай, як лазня, не кажучы ўжо аб парылках і саўнах, якія не забараняюцца амаль нікому, не менш 1-2 разоў у тыдзень.

Ужо ўсім зразумела, што для нашых забруджаных раёнаў патрэбна спецыяльная аздараўленчая праграма /напрацоўка якой у нас ёсць/.

На жаль, гэтай праблеме пры разглядзе мер па "ліквідацыі" вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС не ўдзяляецца належнай увагі, хаця мы аб іх гаворым з трыбун навукова-практычных канферэнцый і выступаем у друку.

**В.МАРЧАНКА,**
**ст. выкладчык кафедры фізічнага выхавання.**

# АБ ПРАВЯДЗЕННІ ПАДПІСКІ

**НА АКЦЫІ ДРУГОГА ВЫПУСКУ СПЕЦЫЯЛІЗАВАНАГА ІНВЕСТЫЦЫЙНАГА ФОНДУ "ГЕНЕРАЛЬНЫ", ЯКІ АКУМУЛЮЕ ІМЯННЫЯ ПРЫВАТЫЗАЗЫЙНЫЯ ЧЭКІ "МАЁМАСЦЬ"**

### *1. Дадзеныя аб фондзе*

Фонд створан у мэтах развіцця рынку каштоўных папер, працэсу раздзяржаўлення і прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці, сацыяльнай абароны найменш забяспечанай часткі насельніцтва краіны.

Фонд прыцягвае грашовыя сродкі грамадзян і юрыдычных асоб, імянныя прыватызацыйныя чэкі "Маёмасць" з мэтай ажыццяўлення інвестыцыйнай дзейнасці.

Акцыянерамі Фонду з"яўляюцца: таварыства з абмежаванай адказнасцю фірма "Август", Сцепаненка Н.Т., Куцько В.В.

### *2.Звесткі аб прадстаячым выпуску каштоўных папер*

Адкрытае акцыянернае таварыства Спецыялізаваны Інвестыцыйны Фонд "Генеральны", акумулюючы прыватызацыйныя чэкі "Маёмасць", аб"яўляе адкрытую падпіску на акцыі другога выпуску на суму 995 000 000 /дзевяцьсот дзевяноста пяць мільёнаў/ рублёў.

Намінальны кошт адной акцыі 2500 рублёў. Выпускаемыя акцыі ўлічваюцца ў выглядзе запісаў на рахунках.

Акцыі выпускаюцца дзвюмя серыямі за грашовыя сродкі і імянныя прыватызацыйныя чэкі "Маёмасць".

Размер статутнага капіталу Фонду з улікам прадстаячай эмісіі аб"яўляецца 1 000 000 000 /адзін мільярд/ рублёў.

Сродкі, сабраныя ў ходзе падпіскі, будуць накіраваны ў статутны капітал Фонду і выкарыстаны для дасягнення мэтаў яго дзейнасці.

Падпіска на акцыі будзе праводзіцца на працягу трох месяцаў з моманту апублікавання гэтага паведамлення з 9.00 да 17.00 гадзін, акрамя суботы і нядзелі, па адрасу: г.Гомель, вул.Ланге, 17, тэл. 53-54-68 і г.Гомель, вул.2-ая Арудзійная, 15-А, тэл.53-65-54.

Падпіска можа быць спынена датэрмінова ў выпадку, калі сума сабраных сродкаў дасягнула аб'яўленага статутнага фонду.

У выпадку недасягнення ўзроўню падпіскі агульны сход акцыянераў зацвярджае фактычна набраны аб'ём статутнага капіталу Фонду, калі ён не супярэчыць дзеючаму заканадаўству.

Падпіска на акцыі будзе праводзіцца шляхам заключэння дагавору падпіскі на акцыі. У выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, пры заключэнні дагавору падпісчык прадстаўляе даведку фінансавых органаў, якая пацвярджае законнасць паходжання сродкаў, што ўносяцца ў лік аплаты акцый.

Сродкі ў аплату набываемых акцый пералічваюцца на спецыяльны чэкавы рахунак N030000910 у Цэнтральным аддзяленні Ашчадбанка N31 г.Гомеля або разлiковы рахунак Фонду N467639 у АКБ "Сож" МФО 151501717 пасля афармлення дагавору падпіскі могуць быць выкарыстаны толькі для дасягнення дзейнасці Фонду.

У выпадку прыняцця рашэння аб адмове ад выпуску акцый сродкі, сабраныя ў ходзе падпіскі, вяртаюцца падпісчыкам пазней 30 дзён з даты прыняцця такога рашэння.

У падпісцы на акцыі можа быць адмоўлена ў выпадку датэрміновага спынення падпіскі, парушэння падпісчыкам дагавору аб падпісцы, непрадастаўлення дакументаў аб крыніцах сродкаў, якія інвесціруюцца ў акцыі Фонду на суму, што перавышае ўстаноўлены размер.

Больш падрабязна з праспектам эмісіі можна азнаёміцца па месцу правядзення падпіскі.

---

СПОРТ

# УКЛАД У АГУЛЬНУЮ ПЕРАМОГУ

У Палацы лёгкай атлетыкі абласнога цэнтра прайшоў зімовы чэмпіянат Беларусі па лёгкаатлетычных шматбор'ях.

Студэнт факультэта фізічнай культуры Максім Марыненка, выступаючы па групе мужчын у сямібор'і, заваяваў сярэбраную ўзнагароду з сумай 5499 ачкоў.

У пяцібор'і наша студэнтка Наталля Сазановіч была ўдастоена бронзавай узнагароды-- 4052 ачкі.

У агульнакамандным заліку шматборцы Гомельшчыны занялі I месца, на наступных -- каманды Віцебскай вобласці і сталічныя спартсмены.

# ДАСЯГНУЎ ЗАПАВЕТНАЙ МЭТЫ

Зусім нядаўна ў Гомельскім Доме фізкультуры і спорту "Спартак" прайшоў чэмпіянат Беларусі па грэка-рымскай барацьбе.

У вагавай катэгорыі да 68 кг наш студэнт Вячаслаў Каваленка заняў 4 месца, упершыню выканаўшы нарматыў "Майстар спорту Рэспублікі Беларусь". А вось Вячаслаў Макаранка ў вагавай катэгорыі да 82 кг узняўся на трэцюю прыступку п"едэстала гонару.

Зборная вобласці зноў, як і ў папярэднія гады, заняла 3 месца, уступіўшы камандам Гродзенскай вобласці і Мінска.

**В.ЗАХАРАЎ.**

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- усеагульнай гісторыі -- заг. кафедры;

-- англійскай мовы -- ст. выкладчыка;

-- эканамічнай інфарматыкі і АСК -- дацэнта /2/;

-- аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі -- асістэнта;

-- бухуліку, кантролю і АГД дацэнта;

-- тэарэтычнай фізікі -- дацэнта;

-- фізвыхавання -- ст. выкладчыка;

-- псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі -- асістэнта.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней І месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Рэгістрацыйны № 221

Спонсары газеты -- НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на Гомельскай фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул.Савецкая, 1.

Рэдактар Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 93
Падпісана да друку 17.02.95.